ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС




6
2013

6 (167)
чэрвень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

*Рэдакцыйная калегія:*
Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

*Рэдакцыйная рада:*
Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан (старшыня рады), Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.

*Рэдакцыя:*
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

## ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| | Слова ад рэдакцыі | 3 |
| | **ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ** | |
| Аляксандр Кушнярэвіч | Архітэктурныя і мастацкія сродкі прэзентацыі гістарычнай памяці магнацкіх родаў ВКЛ у XVII—XVIII стст. | 5 |
| | **ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ** | |
| Артур Кухарэнка | Дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка на тэрыторыі Беларусі (1883—1914 гг.) | 11 |
| | **ПРЭЗЕНТАЦЫЯ** | |
| Алена Карпенка | Партрэты ўладароў і магнатаў ВКЛ (з музеяў Львова і Луцка) | 19 |
| | **ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ** | |
| Вітаўт Чаропка | Юзаф Каліноўскі. Шлях да святасці | 28 |

ЗМЕСТ


ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

| | | |
|---|---|---|
| Міхаіл Касцюк, Уладзімір Навіцкі, Міхаіл Смальянінаў | **Ён самаадданa бараніў Айчыну і шмат зрабіў для навукі** *(Да 90-годдзя з дня нараджэння Івана Ягоравіча Марчанкі)* | 39 |

ГІСТОРЫЯ АДУКАЦЫІ

| | | |
|---|---|---|
| Аляксандр Корзюк | **Вывучэнне гісторыі СССР у сярэдняй школе ў канцы 1950-х — пачатку 1990-х гадоў** | 42 |

ШКОЛА МАЛАДОГА НАСТАЎНІКА

| | | |
|---|---|---|
| Виктория Хриптович | **Начинающий учитель: шаги по преодолению первых трудностей** | 50 |

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

| | | |
|---|---|---|
| Вячаслаў Лазіцкі | **Арганізацыя вучэбнай дзейнасці па развіццю храналагічных уяўленняў і ведаў вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе** | 56 |
| Елена Говоркова | **Православные храмы Могилёва XVII—XVIII веков** *(Методическая разработка по факультативному курсу "Храмы, замки, дворцы Беларуси") (VII класс)* | 61 |
| Мария Дударева | **Учебно-познавательная игра "Умники и умницы" на тему "Короли Речи Посполитой"** *(VIII класс)* | 69 |
| Любовь Межуева | **Интеллектуальная викторина "Люби и знай историю!"** *(IX—XI классы)* | 74 |
| | **Содержание** | 79 |
| | **Summary** | 80 |


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


***Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 213;***
***Тэлефон: +375-29-569-83-95 (МТС).***
***www. p-shkola.by;***
***e-mail: bhc.redaktor@tut.by.***
***РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".***
Падпісана да друку 19.06.2013 г.
Выхад у свет 28.06.2013 г. Афсетны друк.
Фармат 60х841/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,5.
Наклад 970 асобнікаў. Зак. 0947.
*Надрукавана ў друкарні ААТ «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0494112 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


***Да ведама аўтараў!***
***За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.***


© «Беларускі гістарычны часопіс», 2013.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Арганізацыя вучэбнай дзейнасці па развіццю храналагічных уяўленняў і ведаў вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе

*На ўроках гісторыі ў 6 класе настаўнік прадаўжае фарміраваць навыкі работы з храналогіяй. Аўтар прапануе комплекс метадаў, прыёмаў і сродкаў ажыццяўлення эфектыўнай дзейнасці настаўніка і вучняў па авалоданню храналагічнымі ведамі і адпаведнымі спосабамі вучэбнай дзейнасці пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе.*

Пры вывучэнні гісторыі Беларусі для вучняў 6 класаў вельмі важнае значэнне мае засваенне храналагічных ведаў і фарміраванне адпаведных спосабаў вучэбнай дзейнасці. Гэтыя веды ў сістэме школьных гістарычных ведаў цесна спалучаюцца з факталагічнымі і картаграфічнымі. Комплекснае вывучэнне дат, фактаў, іх лакалізацыя ў гістарычна-геаграфічнай прасторы садзейнічаюць фарміраванню ўмення не толькі сістэматызаваць гістарычныя факты, але і аб'ектыўна асэнсоўваць іх, аналізаваць гістарычнае мінулае. Веданне вучнямі храналогіі дазваляе зразумець сутнасць гістарычнага працэсу, сфарміраваць сваё ўласнае стаўленне да мінулага і сучаснасці. Гэтыя аспекты настаўнік абавязкова павінен улічваць пры мадэляванні структуры вучэбнага занятку.

Характэрнай асаблівасцю развіцця храналагічных ведаў вучняў з'яўляецца тое, што менавіта з 6 класа пачынаецца сістэматычнае вывучэнне гісторыі Беларусі як вучэбнага прадмета, для якога характэрны цэласнасць, адносная паўната і лагічная завершанасць, калі працэс навучання адбываецца на падзейна-храналагічным узроўні[1]. Гэта стварае аптымальныя ўмовы для знаёмства вучняў з нацыянальным кампанентам школьных гістарычных ведаў, фарміруе ў школьнікаў устойлівую сістэму ведаў аб гістарычным шляху, пройдзеным беларускім народам.

Фарміраваць храналагічныя веды і ўменні ў шасцікласнікаў неабходна з улікам іх псіхалагічнага развіцця. Настаўнік павінен улічваць той факт, што іх асабісты жыццёвы вопыт не суадносіцца са шматвяковай гісторыяй чалавецтва, гісторыяй Айчыны. Таму вельмі важна *фарміраваць і развіваць храналагічныя ўяўленні і веды вучняў з дапамогай яркай прэзентацыі га-*



***ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.***

*Выконваючы абавязкі загадчыка кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Навукова-метадычныя асновы выкарыстання ЭСН па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (на прыкладзе гісторыі)" (Мн., 2009), "Электронны вучэбна-метадычны комплекс па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла. Навукова-метадычныя асновы складання і сістэмнага прымянення" (Мн., 2012).*

*лоўных характарыстык гістарычнага часу: лінейнасць, незваротнасць, адпаведная працягласць. Для гэтага настаўнікам часцей за ўсё выкарыстоўваецца ўжо знаёмы для вучняў сродак навучання — "стужка часу".*

Як паказвае педагагічная практыка, вучні прадуктыўна засвойваюць гістарычныя даты, калі яны маюць дачыненне да значных, цікавых і яркіх падзей. Такі спосаб засваення гістарычнага матэрыялу ў найбольшай ступені ўласцівы для вучняў 6 і 7 класаў, у якіх пераважае прадметна-вобразнае мысленне. Без дакладных і яскравых вобразаў настаўніку цяжка напоўніць патрэбным зместам фарміруемае ў шасцікласніка ўяўленне пра храналогію. *Пад храналагічным уяўленнем мэтазгодна разумець пачуццёвыя вобразы падзей, з'яў, якія звязаны з успрыманнем часу і захоўваюцца ў памяці без непасрэднага ўздзеяння на свядомасць чалавека.*

*Неабходна адзначыць, што ўжо пры вывучэнні шасцікласнікамі гісторыі Беларусі далейшае фарміраванне храналагічных ведаў адбываецца на аснове атрыманых ведаў падчас вывучэння гісторыі Старажытнага свету ў 5 класе.* У вучняў 6 класа ўжо павінны быць сфарміраваны апорныя паняцці, засвоены адзінкі летазлічэння: год, стагоддзе, эра, наша эра, да нашай эры. Падчас вывучэння ў 5 класе тэмы "Лік гадоў у гісторыі" школьнікі суадносілі ўжо паняцці год — стагоддзе — тысячагоддзе. Таму паўтарыць вывучаны матэрыял можна на першым, уводным, уроку па гісторыі Беларусі ў 6 класе, выканаўшы храналагічныя задачы на стужцы часу.

За час вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе вучням неабходна авалодаць спецыяльнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, звязанымі з лакалізацыяй гістарычных падзей, з'яў, працэсаў у часе і прасторы:

— называць даты гістарычных падзей;

— вызначаць паслядоўнасць і працягласць гістарычных падзей;

— ведаць перыядызацыю гісторыі Беларусі старажытных часоў і Сярэдневякоўя;

— суадносіць даты падзей гісторыі Беларусі са стагоддзем;

— вызначаць узаемасувязі гістарычных дат з гістарычнымі фактамі і гісторыка-геаграфічнай прасторай;

— складаць храналагічныя веды і ўяўленні ў вызначаную сістэму гістарычных ведаў аб асноўных перыядах гістарычнага развіцця беларускага народа;

— выкарыстоўваць засвоеныя храналагічныя веды і сфарміраваныя храналагічныя ўяўленні для пабудовы неабходных высноў і абагульненняў[2].

Змест школьнага курса гісторыі ўключае ў сябе розныя па сваёй значнасці даты. Падчас вывучэння гісторыі Беларусі сярод гістарычных дат неабходна вылучаць апорныя, якія маюць дачыненне да асноўных гістарычных фактаў і падзей. *У вучэбным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 6 класа апорныя даты ў тэксце пазначаны тлустым шрыфтам і прыведзены ў метадычнай частцы дапаможніка "Асноўныя даты і падзеі"*[3]. Такая структура дазваляе вучням арыентавацца ў вялікай колькасці гістарычных дат, настаўніку — акцэнтаваць увагу вучняў на найбольш значных датах, а структураваную форму вучэбнага храналагічнага матэрыялу можна выкарыстоўваць для сістэматызацыі і замацавання ведаў.

*З пункту гледжання педагагічнай навукі і методыкі выкладання гісторыі алгарытм фарміравання ў вучняў 6 класа храналагічных уяўленняў і засваення храналагічных ведаў прадугледжвае:*

— фарміраванне ў вучняў матывацыі для засваення храналогіі ў сістэме школьных гістарычных ведаў;

— фарміраванне першасных храналагічных уяўленняў як асновы ажыццяўлення працэсу засваення гістарычнай храналогіі праз нагляднавобразную прэзентацыю галоўных якасцей гістарычнага часу і актуалізацыю атрыманых ведаў па храналогіі і сфарміраваных храналагічных уяўленняў;

— азнаямленне шасцікласнікаў з храналагічнымі ведамі па тых перыядах, якія будуць вывучацца;

— уяўленне вучнямі факталагічнага зместу даты, якую неабходна засвоіць (іншымі словамі атрыбутызацыя гістарычнага факта з месцам, дзе ён здзейсніўся і калі, або стварэнне ААД — арыентуючай асновы дзеянняў);

— арганізацыя работы вучняў з гістарычнымі датамі, ажыццяўленне кантролю за ходам работы і яе вынікам;

— засваенне асобных гістарычных дат і фарміраванне асабістых гістарычных уяўленняў, а затым іх сістэматызацыя;

— арганізацыя паступовага пераходу ад пакрокавага кантролю да самакантролю, ад магчымай карэкцыі вынікаў засваення вучнямі храналогіі з боку настаўніка да вучнёўскай самакарэкцыі[4].

Ажыццяўленне прапанаванага алгарытму пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе павінна адбывацца праз эфектыўную арганізацыю дадзенага працэсу з дапамогай аптымальна падабраных настаўнікам метадаў, прыёмаў і сродкаў засваення храналагічных ведаў.

*Храналагічныя веды можна засвойваць з дапамогай наступных метадаў:*

— раздзельны метад (спачатку ажыццяўляецца запамінанне даты, а затым устанаўліваецца яе сувязь з канкрэтным фактам, падзеяй, гісторыка-геаграфічнай прасторай);

— кампактны (дата запамінаецца і адначасова фарміруецца навык яе прымянення падчас выканання вучэбных заданняў);

— алгарытмічны (запамінанне дат і фарміраванне храналагічных уяўленняў, а таксама звязаных з імі вучэбных навыкаў адбываюцца ў працэсе паслядоўнага выканання алгарытму вучэбных дзеянняў — пакрокавых інструкцый настаўніка, якія канкрэтна апісваюць парадак дзеянняў школьнікаў для дасягнення вучэбнай мэты)[5].

Працэс фарміравання храналагічных уяўленняў шасцікласнікаў адбываецца эфектыўна, калі вызначаныя настаўнікам тыповыя рысы ствараемых вобразаў асэнсоўваюцца вучнямі ў якасці прыкмет канкрэтнай гістарычнай падзеі і звязанай з ёю датай. Вучні лягчэй засвойваюць гістарычныя даты, якія можна ўявіць праз нагляднасць і вобразнасць звязаных з імі падзей, фактаў. Таму настаўніку гісторыі ў 6 класе неабходна падабраць адпаведныя прыёмы і сродкі навучання. У педагагічнай практыцы падчас выкладання гісторыі шырока ўжываюцца наступныя прыёмы стварэння храналагічных вобразаў і ўяўленняў: параўнальны аналіз гістарычнай падзеі ці факта, сюжэтнае апавяданне, апавяданне-загадка "Пра якую гістарычную постаць ідзе гаворка?", гістарычнае сачыненне на тэму "Гэта адбылося ў...", апісанне зместу мастацкага твора і інш. Падчас тлумачэння новага матэрыялу, а таксама пры яго паўтарэнні і сістэматызацыі настаўнік гісторыі можа выкарыстоўваць прыём складання ланцужка: дата — падзея — вобраз (мастацкі выраз). *Напрыклад, "3 сакавіка 1067 г." — "бітва на Нямізе" — "кроў, разбурэнне і нястачы — пра гэта напэўна ніколі не думала страла, якая была выпушчана з лука"*. Мэтазгодна для стварэння вобразнага ўяўлення працытаваць урывак са "Слова аб палку Ігаравым": *"На Нямізе галовы сцелюць снапамі, харалужнымі малоцяць цапамі, жыццё кладуць на таку злюцела, веюць душу ад цела. Нямігі крывавыя берагі не збожжам былі засеяны зноў — засеяны косцьмі рускіх сыноў"*[6]. Уяўленні вучняў пры аналізе прыведзенага ўрыўка павінны стымулявацца праз абуджэнне цікаўнасці да вывучаемага гістарычнага матэрыялу.

Каштоўную дапамогу ў арганізацыі вучэбнай дзейнасці шасцікласнікаў па засваенню храналагічных ведаў акажа *навучанне прыёмам працы з тэкстам вучэбнага дапаможніка:* знайсці ў канкрэтным абзацы тэксту ці ў пункце параграфа новыя для вучняў даты, запісаць іх у сшытак у выглядзе храналагічнай табліцы. У 6 класе вучням неабходна прадоўжыць фарміраваць навык складання сінхраністычных табліц па гісторыі.

Падчас тэматычнага абагульнення ці праўдзення этапнага кантролю мэтазгодна выкарыстоўваць храналагічныя дыктоўкі. У настаўніка гісторыі ў дадзеным выпадку існуе вялікая прастора для канструявання заданняў тэставага характару, якія фарміруюць у вучняў уменні вызначаць паслядоўнасць гістарычных дат і суадносіць іх з падзеямі (гістарычнымі фактамі), імёнамі гістарычных асоб і месцам дзеяння. Прапануем для прыкладу наступныя заданні.

**I. Тэставае заданне з выбарам адказу на праверку ведання дат і падзей.**

*1. Вызначыце храналагічны перыяд, на працягу якога адбылося першае пранікненне першабытнага чалавека на тэрыторыю Беларусі:*

*а) 600 тыс. гадоў таму;*
*б) 100—35 тыс. гадоў таму;*
*в) 10—6 тыс. гадоў таму;*
*г) 5—3 тыс. гадоў таму.*

**II. Тэставыя заданні для праверкі ўмення вызначаць сінхроннасць фактаў, суадносіць іх з пэўным перыядам гістарычнага развіцця.**

*1. Вызначыце, якія гістарычныя асобы былі сучаснікамі:*

*а) Рагвалод і Уладзімір Святаславіч;*
*б) Рагнеда і Ефрасіння Полацкая;*
*в) Усяслаў Брачыславіч і Уладзімір Манамах;*
*г) Кірыла Тураўскі і Яраслаў Мудры.*

*2. Вызначыце падзеі, якія адбыліся ў часы княжання ў Полацку Усяслава Брачыславіча:*

*а) бітва на Нямізе;*
*б) будаўніцтва Полацкага Сафійскага сабора;*
*в) выгнанне полацкіх князёў у Візантыю;*
*г) заснаванне Полацкай епархіі.*

**III. Тэставыя заданні на вызначэнне храналагічнай паслядоўнасці, праверкі ведання дат і падзей, фарміравання ўменняў вызначаць іх паслядоўнасць і ўзаемасувязі.**

*1. Правільна вызначыце паслядоўнасць змены заняткаў і спосабаў апрацоўкі зямлі старажытным чалавекам:*

*а) ворыўнае земляробства;*
*б) збіральніцтва;*
*в) матычнае земляробства;*
*г) падсечна-агнявое земляробства.*

*2. Правільна вызначыце паслядоўнасць змены прылад працы старажытнага чалавека:*

*а) барана-сукаватка;*
*б) матыка;*
*в) палка-капалка;*
*г) рала.*

*3. Правільна вызначыце паслядоўнасць з'яўлення на гістарычнай арэне полацкіх князёў:*

*а) Брачыслаў;*
*б) Ізяслаў;*

вучням для фарміравання ўмення суадносіць гістарычныя факты (падзеі) з пэўнымі гістарычнымі перыядамі можна прапанаваць запоўніць падчас вывучэння раздзела "Беларускія землі ў старажытныя часы" табліцу "Старажытны час".

Падчас правядзення этапнага кантролю шасцікласнікам прапануецца самастойна, не карыстаючыся вучэбным дапаможнікам, запоўніць табліцу.

*Табліца*

**Старажытны час**

| Каменны век | | | Бронзавы век | Жалезны век |
|---|---|---|---|---|
| палеаліт | мезаліт | неаліт | | |
| | | | | |

Дзейсным дыдактычным інструментам, які рэкамендуецца настаўнікам гісторыі выкарыстоўваць на вучэбных занятках, з'яўляецца комплекснае мультымедыйнае вучэбнае выданне "Гісторыя Беларусі старажытных часоў", якое дазваляе арганізаваць сістэмнае вывучэнне курса нацыянальнай гісторыі вучнямі 6 класаў. Яго падрыхтаваў калектыў аўтараў — С.В.Паноў, А.М.Балыкіна, Д.М.Бузун, Л.С.Скакун, А.А.Качэванава, С.В.Вайтовіч[8]. У адрозненне ад друкаванага вучэбнага матэрыялу ў дапаможніку электронны сродак навучання "Гісторыя Беларусі старажытных часоў" грунтуецца на праблемна-модульным прынцыпе. Кожная тэма ўяўляе сабой адносна завершаны модуль вучэбнай інфармацыі, кожны з якіх асвятляе адну з праблем гістарычнага развіцця першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Такое дыдактычнае забеспячэнне дазваляе фарміраваць і развіваць храналагічныя ўяўленні вучняў.

Такім чынам, для эфектыўнай арганізацыі працэсу фарміравання храналагічных ведаў і ўяўленняў у вучняў 6 класа настаўнік гісторыі павінен улічваць наступнае:

— фарміраванне і развіццё храналагічных уяўленняў, ведаў павінна ажыццяўляцца ў агульнай сістэме арганізацыі вучнёўскай дзейнасці па засваенню шматкампанентнага комплексу вучэбных гістарычных ведаў і спосабаў вучэбнай дзейнасці;

— фарміраванне храналагічных уяўленняў з'яўляецца вельмі складаным і працяглым працэсам паслядоўнага раскрыцця якасных і колькасных асаблівасцей вывучаемых аб'ектаў;

— працэс фарміравання храналагічных уяўленняў вучняў павінен абапіраецца на разуменне імі якасцей часу і паступовае засваенне імі ўзаемасувязей гістарычнай даты, гістарычнага факта (падзеі) і гісторыка-геаграфічнай прасторы;

— засваенне храналагічнага матэрыялу павінна абапірацца на яркія наглядныя гістарычныя вобразы і ўяўленні;

— у вучняў спачатку адбываецца засваенне асобных гістарычных дат і фарміраванне асобных гістарычных уяўленняў, а затым іх сістэмы;

— паспяховае фарміраванне храналагічных ведаў і ўменняў па гісторыі Беларусі адбываецца ва ўзаемасувязі з вывучэннем усеагульнай гісторыі;

— пры выбары канкрэтных прыёмаў і сродкаў выкладання храналагічнага матэрыялу на кожным асобным уроку неабходна абапірацца на разуменне характару гістарычнага факта, яго месца ў гісторыі і ўзаемасувязей з іншымі гістарычнымі фактамі (падзеямі);

— сістэма навучання павінна фарміраваць у вучня ўяўленне аб часе як шляху развіцця гістарычных падзей і датах як момантах гістарычнага развіцця.

Вызначаныя палажэнні неабходна ўлічваць у якасці метадычных умоў для павышэння эфектыўнасці працэсу фарміравання і развіцця храналагічных уяўленняў і ведаў пры арганізацыі і ажыццяўленні гэтага спецыфічнага віду вучэбнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе.

[1] Усеагульная гісторыя. Гісторыя Беларусі. V—XI класы. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мн., 2012. С. 4—5; Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" / Гісторыя: праблемы выкладання. 2009, № 3. С. 3—12.

[2] Там жа.

[3] Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. агульна-адукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г.В.Штыхаў, С.М.Цемушаў, В.У.Ракуць; пад рэд. Г.В.Штыхава, Ю.М.Бохана. Мн., 2009. С. 140.

[4] Вяземский Е.Е. Теория и методика преподавания истории: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 384; Гальперин П.Я. Психология мышления и учение о поэтапном формировании умственных действий // Исследование мышления в советской психологии. М., 1966. С. 236—277.

[5] Вяземский Е.Е. Теория и методика преподавания истории: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. С. 256—257; Короткова М.В. Метоика обучения истории в схемах, таблицах, описаниях: практич. пособие для учителей / М.В.Короткова, М.Т.Студеникин. М., 1999. С. 92.

[6] Слова пра паход Ігаравы / перакл. Р.Барадуліна. Мн., 1986. С. 144.

[7] Вяземский Е.Е. Теория и методика преподавания истории: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 260—261.

[8] Гісторыя Беларусі старажытных часоў [Электронны рэсурс]. Электрон. дад. і прагр. (85 Мб). Мн., 2005. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).